Чацвер, 21 Студзень 2021

7 сутак арышту – за паветраныя балонікі на акне ў Дуброўне

Друкаваць (/news/sud/item/3864-novy-vid-piketavannya?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=d66ba08f0bf8beed14dd62eaafc7c6ec108b304b)

Ацаніць гэты матэрыял (5 галасоў)



(/media/k2/items/cache/b530b29364dc197ef695fa1cde29db91_XL.jpg)

Міхаіл Чамурака. Фота: facebook.com

21 студзеня суд Дубровенскага раёну прысудзіў прадпрымальніку Міхаілу Чамураку 7 сутак адміністрацыйнага арышту паводле ч.3 арт. 23.34 КаАП. Бел-чырвона-белыя паветраныя балонікі, вывешаныя на акне прыватнага дому, суд палічыў публічным выказваннем грамадска-палітычных інтарэсаў. Актывіста ўзялі пад варту адразу пасля абвяшчэння прысуду.

Як паведамляла «Віцебская вясна» (/news/zatrymanni/item/3856-zatrymali-mikhaila-chamuraku), 15 студзеня ў Дуброўне на 72 гадзіны быў затрыманы мясцовы актывіст **Міхаіл Чамурака**. Праз трое сутак, 18 студзеня, яго прывезлі з ізалятару часовага ўтрымання (ІЧУ) Воршы назад у Дуброўна, дзе меўся адбыцца суд, аднак суддзя адправіла пратакол на дапрацоўванне і перанесла паседжанне на 21 студзеня.

Адміністрацыйную справу, распачатую ў дачыненні да Міхаіла Чамуракі паводле ч. 3 арт. 23.34, разглядала **суддзя Марыя Цыклінская**. Па словах актывіста, ён быў вельмі здзіўлены, што пратакол, агучаны на судзе 21 студзеня, тычыўся балонікаў на акне, канфіскаваных міліцыяй падчас вобшуку, хаця падставай для ператрусу былі бел-чырвона-белыя стужкі, паразвешаныя на слупах у райцэнтры, – шукалі менавіта іх.

> На судзе Чамурака заявіў, што бел-чырвона-белыя паветраныя шарыкі віселі на акне цягам 4-х апошніх месяцаў і нікому не шкодзілі. Дадаў, што на падваконні, апроч таго, красуюцца расліны зялёнага колеру. Але суд прапусціў гэты факт міма вушэй.

Актывіст таксама хадайнічаў, каб у суд былі пададзеныя запісы з камераў відэаназірання, бо сцвярджаў, што ў час, які пазначаны ў пратаколе, удома яго не было і, адпаведна, развешваць балонікі ён фізічна не мог. Аднак аказалася, што, паводле мясцовай міліцыі, 15 студзеня ніводная камера відэаназірання ў тым раёне не працавала.

> Сведкам у судзе выступіў супрацоўнік міліцыі **Сяргей Калінін**, які пацвердзіў факт вывешвання Чамуракам БЧБ-шарыкаў 15 студзеня, але ніякіх канкрэтных доказаў гэтага суду не паказаў. Было лішнім: суд паверыў міліцыянту на слова... Рашэнне суддзі Марыі Цыклінскай: прызнаць вінаватым і пакараць адміністрацыйным **арыштам на 7 сутак**.

З улікам трох сутак, праведзеных у аршанскім ІЧУ да суду, Міхаілу Чамураку давядзецца адседзець яшчэ чатыры. Пасля судовага паседжання Міхаіла Чамураку адразу затрымалі. Выйдзе на волю 25 студзеня.

С.Горкі

Апублікавана ў Суд (/news/sud)
Тэгі: Міхаіл Чамурака (/itemlist/tag/Міхаіл%20Чамурака) Дуброўна (/itemlist/tag/Дуброўна) артыкул 23 34 КаАП (/itemlist/tag/артыкул%2023%2034%20КаАП)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « «Абутымі нагамі ўдарыла па бусе». У Віцебску пачаўся працэс над Юліяй Кашаверавай (/news/sud/item/3863-pratses-nad-yuliyaj-kashaveravaj) Да двух гадоў «хіміі» прысудзілі навапалачан Віктара Шаўру і Віталя Шыцікава – за падзеі 10 жніўня » (/news/sud/item/3865-za-padzei-10-zhniunya)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/3864-novy-vid-piketavannya#startOfPageId3864)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https(/